# Адказнасць за гвалтоўныя знікненні ў Беларусі : былы член элітнага атрада забойцаў Лукашэнкі паўстаў перад судом у Швейцарыі

**(Сэн-Гален, Парыж, Мінск, Жэнева, 30 жніўня 2023 г.) Юрый Гараўскі, былы супрацоўнік САХРа — атрада, які падпарадкоўваўся прэзідэнту А. Лукашэнку — паўстане перад крымінальным судом у швейцарскім Сэн-Галене. Ён абвінавачваецца ва ўдзеле ў гвалтоўных знікненнях трох ключавых палітычных апанентаў Лукашэнкі ў 1999 годзе. Судовае разбіральніцтва было ініцыяванае з прычыны крымінальных пазоваў сваякоў двух ахвяр і падтрымліваецца FIDH, TRIAL International і арганізацыяй "Вясна", якія адначасова падалі скаргу аб узбуджэнні крымінальнай справы.**

Юрый Гараўскі будзе прыцягнуты да адказнасці за гвалтоўныя знікненні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага 25 гадоў таму ў Беларусі.

Гэты крымінальны працэс прынцыпова адрозніваецца ад папярэдняй практыкі: упершыню грамадзянін Беларусі паўстае перад судом за гвалтоўнае знікненне з прычыны выкарыстання механізму ўніверсальнай юрысдыкцыі. Гэта таксама першае прымяненне ў Швейцарыі палажэння, якое прадугледжвае крымінальную адказнасць за дадзенае злачынства. Судовае разбіральніцтва запланавана на 19 і 20 верасня 2023 года.

"*Першы ў гісторыі судовы пераслед меркаванага сябра "эскадрону смерці" Лукашенкі з'яўляецца магутным сігналам грамадству: правасуддзе па міжнародных злачынствах можа і будзе ажыццяўляцца незалежна ад дзяржаўных межаў і часу, якое прайшло з моманту здзяйснення злачынстваў*", — **заявіў Павел Сапелка, юрыст "Вясны"**. "*Прынцып універсальнай юрысдыкцыі трывала і грунтоўна замацоўваецца ў судовых сістэмах. Крок за крокам мы дамагаемся таго, каб міжнародныя злачынцы не змаглі пазбегнуць адказнасці*".

## Знікненні палітычных апанентаў Лукашэнкі

У перыяд з траўня па верасень 1999 г. у Мінску зніклі некалькі ключавых фігур апазіцыі: **Юрый Захаранка**, былы міністр унутраных спраў, **Віктар Ганчар**, былы намеснік прэм'ер-міністра ў першыя гады прэзідэнцтва Лукашэнкі, і **Анатоль Красоўскі**, бізнесмен і блізкі сябар Ганчара. Сем'і загінулых рабілі шматлікія спробы атрымаць інфармацыю пра месцазнаходжанне сваіх сваякоў. Аднак праваахоўныя органы Беларусі сістэматычна адмаўляліся ад пераследу вінаватых і прыцягнення іх да адказнасці.

## Механізм універсальнай юрысдыкцыі дазваляе ажыццявіць прарыў пасля шматгадовых бясплённых спробаў дамагчыся справядлівасці

"*Гэты працэс — вялікі рывок у барацьбе з беспакаранасцю за злачынствы, учыненыя ў Беларусі*", — заявіў **Севярын Вальц, адвакат, які прадстаўляе інтарэсы сваякоў ахвяраў**. "*Галоўная надзея маіх кліентаў — дамагчыся пэўнасці ў лёсе сваіх бацькаў праз рашэнне, вынесенае ў рамках належнага судовага разбору*".

"*Гэты судовы працэс будзе мець гістарычнае значэнне. Дзякуючы гэтаму працэсу механізм універсальнай юрысдыкцыі становіцца ўсё больш рэальным і канкрэтызаваным*", — заявіла **Воні Рамбаламанана, старэйшы юрысконсульт TRIAL International**. "*Гэта справа створыць прэцэдэнт, і судовы пераслед падобных злачынстваў у Швейцарыі паслужыць прыкладам для ўсяго свету*".

## Пераломны момант для Беларусі ?

У Беларусі палітычныя апаненты, праваабаронцы, адвакаты, журналісты і радавыя грамадзяне падвяргаюцца арыштам, затрыманням па палітычных матывах і пазбаўляюцца сваіх асноўных правоў.

Нядаўні прысуд супраць праваабаронцаў з Вясны, у тым ліку супраць лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру 2022 года Алеся Бяляцкага з'яўляецца помстай за 25 гадоў іх праваабарончай дзейнасці ў Беларусі.

"*Гэта можа стаць пераломным момантам для міжнароднага правасуддзя ў дачыненні да злачынстваў, учыненых рэжымам у Беларусі*", — дадаў **Ілля Нузаў, кіраўнік аддзела FIDH па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі**. "*Суд над Гараўскім можа не толькі прывесці да асуджэння аднаго з выканаўцаў жахлівых злачынстваў, але і выявіць факты, якія пасля могуць быць выкарыстаныя для пераследу тых, хто аддаваў загады аб здзяйсненні гэтых злачынстваў, уключаючы самога Лукашэнку*".

## Кантакты для СМІ

**TRIAL International**
Бенуа Мейстрэ, юрысконсульт (французская і англійская мовы)
Тэл: + 41 77 428 76 77
media@trialinternational.org

**Міжнародная федэрацыя за правы чалавека (FIDH)**
Raphaël Lopoukhine
+33 6 72 28 42 94
rlopoukhine@fidh.org

**Праваабарончы цэнтр "Вясна"**
https://t.me/Viasnainfo